*Эмануіл Іофе, доктар гістарычных навук, прафесар БДПУ імя М.Танка*

# ГЭТА ТВАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ, ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ! (ПЕРШАЯ У СВЕЦЕ)

Перш чым пачаць размову аб «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», нагадаем, што азначае тэрмін «энцыклапедыя». Ён паходзіць ад грэчаскіх слоў *encyklios paideia* — навучанне па ўсім коле ведаў і абазначае навуковае або навукова-папулярнае даведачнае выданне, якое ўтрымлівае сістэматызаваны звод ведаў. Матэрыял у энцыклапедыі звычайна размяшчаецца ў алфавітным парадку або па сістэматычным прынцыпе (па галінах ведаў). Адрозніваюць універсальныя, галіновыя і рэгіянальныя энцыклапедыі. «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» — гэта галіновая энцыклапедыя.

У адрозненне ад энцыклапедычных слоўнікаў энцыклапедыі адметныя тым, што ў іх артыкулах найбольш поўна тлумачацца найважнейшыя катэгорыі навук, даецца шырокая бібліяграфія.

У нашай рэспубліцы ў навуковы зварот трывала ўвайшла «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (1969—1975) — універсальны даведнік па ўсіх галінах ведаў, першая ў гісторыі беларускага народа 12-томная энцыклапедыя. У 1978—1982 гадах была выдадзена пяцітомная рэгіянальная энцыклапедыя «Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя» (паралельна на беларускай і рускай мовах). Значнай з'явай у навуковым і культурным жыцці Беларусі стаў выхад пяцітомнай «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва» (1984—1988), аднатомнай энцыклапедыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945» (1990), іншых энцыклапедый.

Шырокая грамадскасць рэспублікі, перш за ўсё моладзь, студэнцтва, школьныя педагогі (у першую чаргу настаўнікі гісторыі), выкладчыкі сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, бакалаўры, магістры, шматлікія навукоўцы, з нецярпеннем чакала выдання асобнай, спецыяльнай энцыклапедыі па гісторыі Беларусі. У сувязі з гэтым прывядзём словы з прадмовы першага галоўнага рэдактара «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» Міхася Ткачова да першага тома ЭГБ: «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» разлічана на гісторыкаў-навукоўцаў, настаўнікаў, студэнтаў, школьнікаў і на ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй свайго народа, свайго краю».

У лістападзе 2003 г. у кнігарні рэспублікі паступіла другая кніга апошняга, шостага (у дзвюх кнігах), тома «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Такім чынам, завяршылася выданне гэтай патрэбнай і каштоўнай энцыклапедыі, якое пачалося ў 1993 г.

Большасць артыкулаў ЭГБ напісана на высокім навуковым узроўні і ў цэлым адпавядае сусветным стандартам.

Спынімся на асобных праблемах і на тым, чым карысна і для чаго патрэбна гэта выданне для настаўнікаў гісторыі школ, ліцэяў, гімназій, каледжаў і іншых спецыяльных сярэдніх устаноў.

Па-першае, у адрозненне ад школьных і універсітэцкіх падручнікаў, пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР», двухтомных «Нарысаў гісторыі Беларусі» і іншых кніг па гісторыі Беларусі, выдадзеных за апошнія гады, у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» найбольш поўна, з улікам найноўшых дасягненняў гістарычнай навукі адлюстраваны шматвяковы шлях беларускага народа (ад сівой

даўніны да сучаснасці) у непарыўнай сувязі з сусветным гістарычным працэсам.

Па-другое, ЭГБ асвятляе ўсе значныя і важныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі з часоў першабытнаабшчыннага ладу па 2002 г. Настаўнік, выкладчык гісторыі Беларусі знойдзе на яе старонках каштоўны матэрыял аб палітычных, грамадскіх, ваенных, культурных з'явах і падзеях, адміністрацыйна-тэрытарыяльных падзелах, стане эканомікі, навукі, тэхнікі, адукацыі і культуры на розных этапах беларускай гісторыі.

Па-трэцяе, значная ўвага надаецца ваеннай гісторыі Беларусі, таленавітым палкаводцам і военачальнікам — беларусам і ўраджэнцам беларускіх зямель, шматлікім войнам і бітвам у перыяд ад сярэднявечча да «афганскай» вайны, змаганню з рознымі заваёўнікамі, што нападалі на нашу зямлю. Асобае месца ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» адведзена падзеям і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.

Па-чацвёртае, дзесяткі артыкулаў прысвечаны нацыянальна-вызваленчай і рэвалюцыйнай барацьбе беларускага народа ў дакастрычніцкі час, асабліва ў 1905—1907 гг., падзеям Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, Грамадзянскай вайны 1918—1920 гг., складаным, а часам і драматычным грамадска-палітычным падзеям на тэрыторыі Беларусі XX і пачатку XXI ст.

Па-пятае, даволі шырока і ўсебакова разгледжана гісторыка-археалагічная, этнаграфічная, лепшая архітэктурная і літаратурна-мастацкая спадчына Беларусі.

Па-шостае, асобныя артыкулы прысвечаны гісторыі нацыянальных меншасцей Беларусі — палякаў, яўрэяў, татар, рускіх, украінцаў, літоўцаў, латышоў, прадстаўнікоў іншых этнасаў, якія здавён жывуць на беларускай зямлі, паказана іх роля ў эканамічным, палітычным і духоўным развіцці Беларусі, іх уклад у агульную скарбонку беларускай і сусветнай культур.

Па-сёмае, у адрозненне ад папярэдніх энцыклапедычных выданняў у ЭГБ упершыню асвятляецца шматграннае жыццё беларускай дыяспары (беларусаў далёкага і блізкага замежжа) розных часоў.

Па-восьмае, у рэцэнзуемай намі энцыклапедыі важнае месца займае асвятленне праблем гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, археаграфіі, краязнаўства, архівазнаўства, геральдыкі, нумізматыкі, музеязнаўства, сфрагістыкі, генеалогіі, гістарычнай картаграфіі і іншых прыкладных, дапаможных гістарычных дысцыплін.

У наш час, калі сярод шырокіх колаў насельніцтва Беларусі рэзка павялічылася цікавасць да пытанняў генеалогіі і радаводаў, карысна адзначыць, што больш за 5 тыс. артыкулаў ЭГБ прысвечана гістарычным асобам і іх радаводам.

Так, А.П.Грыцкевіч у артыкуле «Агінскія» (Т. 1. — С. 32—34) дае малавядомы матэрыял аб радаводзе старадаўняга магнацкага роду герба «Агінец», прадстаўнікі якога адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі, а Р.В.Баравы і Л.Л.Чарняўская ў артыкуле «Белазоры» (Т. 1. — С. 344) прыводзяць малавядомыя і невядомыя шырокаму колу чытачоў звесткі аб радаводзе старажытнага шляхецкага роду герба «Венява», прадстаўнікі якога займалі адміністрацыйна-дзяржаўныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім.

Аўтарамі многіх артыкулаў выступаюць не толькі вядучыя вучоныя Рэспублікі Беларусь, але і буйнейшыя спецыялісты-навукоўцы Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Польшча, Злучаных Штатаў Амерыкі і іншых краін.

У ЭГБ прыводзяцца цікавыя звесткі аб навукоўцах іншых краін, якія займаліся даследаваннямі па гісторыі і культуры Беларусі. Так, у ёй апублікаваны артыкулы пра польскіх гісторыкаў — Ежы Ахманскага, Юліуша Бардаха, Аляксандру Бергман, братоў Антона і Яўгена Міраповічаў, Юрыя Туронка, Алену Глагоўскую, пра нямецкіх гісторыкаў Хрысціяна Герлаха, Бернгарда К'яры, Еханеса Шлоцэ, Райнера Ліндперэ, Паула Коля і іншых даследчыкаў з розных краін.

Настаўнікам гісторыі Беларусі, у першую чаргу тым, хто працуе ў сельскай мясцовасці і пазбаўлены магчымасці часта прыязджаць у абласныя цэнтры і буйныя гарады рэспублікі, трэба ведаць, што ЭГБ багата ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі, малюнкамі,

схемамі, картамі. Каб дапамагчы чытачу арыентавацца ў сямі кнігах выдання і пазбегнуць паўтораў інфармацыі, у сумежных па тэматыцы артыкулах выкарыстана сістэма спасылак, набраных курсівам. Вялікую дапамогу настаўнікам і чытачам ЭГБ акажа імянны паказальнік па ўсіх тамах «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» на беларускай і польскай мовах, змешчаны на с. 443—612 другой кнігі шостага тома.

У працэсе работы над «Энцыклапедыяй гісторыі Беларусі» мянялася яе канцэпцыя і галоўныя рэдактары — Міхась Ткачоў, Барыс Сачанка, Генадзь Пашкоў.

Высокім навуковым узроўнем, аб'ектыўнасцю, праўдзівасцю, змястоўнасцю, кампетэнтнасцю і навізной адрозніваюцца многія матэрыялы ЭГБ. Гэту характарыстыку можна прымяніць да артыкулаў «Абарончыя збудаванні» (аўтар М.А.Ткачоў), «Асвета» (Э.К.Дарашэвіч, У.С.Пасэ, Г.Р.Сянькевіч, М.А.Ткачоў, А.В.Трухан), «Асветніцтва» (Э.К.Дарашэвіч), «Беларусазнаўства» (З.В.Шыбека), «Беларусізацыя» (А.С.Кароль), «Беларускае шкло» (А.Дз.Ляўковіч, М.М.Яніцкая), «Беларуская аперацыя 1944» (У.І.Лемяшонак), «Беларуская ваенная акруга» (М.І.Глязер), «Беларуская Народная Рэспубліка» (А.М.Сідарэвіч), «Беларуская сацыялістычная грамада» (С.С.Рудовіч), «Беларускі архіў» (Г.Я.Галенчанка), «Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух» (А.К.Каўка), «Беларускі нацыянальны камісарыят» (В.У.Скалабан) і інш.

Значную навуковую каштоўнасць мае артыкул «Герой Савецкага Саюза» (Т. 2. — С. 520—524), дзе па гадах прысвоення пералічаны Героі і двойчы Героі Савецкага Саюза — беларусы і ўраджэнцы Беларусі, а таксама прадстаўнікі іншых народаў, якія вызначыліся ў баях за Беларусь. У ЭГБ змешчаны спецыяльны артыкул «Кавалер ордэна славы трох ступеняў» (Т. 3. — С. 516), а пра кожнага такога кавалера напісаны асобны артыкул.

У 1990 г. аўтар гэтых радкоў крытыкаваў энцыклапедыю «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945» за тое, што ў ёй адсутнічаў артыкул аб адным з вышэйшых кіраўнікоў органаў унутраных спраў і дзяржбяспекі БССР і СССР, генерал-лейтэнанце Л.Ф.Цанаве. Цяпер ён падрыхтаваны рэдакцыяй ЭГБ і апублікаваны (Т. 6. — Кн. 11. — С. 93). Чытач знойдзе таксама звесткі аб кіраўніках беларускай калабарацыі ў 1941—1944 гг. і актыўных калабарацыяністах у гэты перыяд.

На вялікі жаль, «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» не пазбаўлена пэўных недахопаў. На мой погляд, галоўным прадметам даследавання, дакладней, артыкулаў ЭГБ павінны быць гістарычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі, гістарычныя асобы. У цэлым рэдакцыйная калегія ЭГБ справілася з гэтай задачай, чаго нельга сказаць аб артыкулах пра асобных гісторыкаў, што займаюцца гэтымі даследаваннямі. Па якіх крытэрыях ацэньвалася іх роля ў гістарычнай навуцы, асабісты ўклад у яе?

Дванаццацітомная «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (1969—1975) такім крытэрыем лічыла навуковую ступень доктара навук. І хоць і ў той час працавалі таленавітыя кандыдаты гістарычных навук, што шмат зрабілі для навукі, але гэта быў прынцыповы крытэрый, з якім у той час не спрачаліся.

Цяпер наогул зніклі ўсе крытэрыі і рэдакцыйная калегія «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», у першую чаргу кіраўніцтва выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя», прысвоіла сабе паўнамоцтвы і функцыі галоўнага арбітра, суддзі ў вызначэнні біяграфічных звестак і характарыстыцы навуковых прац кожнага гісторыка. У сувязі з гэтым можна ўспомніць словы героя камедыі А.Грыбаедава «Гора ад розуму» Чацкага «А суддзі хто?..».

Невядома, згодна з чым усе даследчыкі гісторыі Беларусі, не гаворачы ўжо пра іншых гісторыкаў, падзелены на тры катэгорыі.

Першая катэгорыя — гэта акадэмікі і члены-карэспандэнты Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, асобныя дактары гістарычных, філасофскіх і філалагічных навук. Для чытачоў яны прадстаўляюцца «карыфеямі», якія зрабілі вялікі ўклад у гістарычную навуку, ледзь не да перавароту ў ёй. Змешчана бібліяграфія іх навуковых прац, фотаздымак.

Другая катэгорыя — асобныя дактары і кандыдаты гістарычных навук. У ЭГБ дадзена ацэнка іх укладу ў гістарычную навуку і падрабязная бібліяграфія навуко-

вых прац. Адно толькі адрозненне — фотаздымак персаналіі адсутнічае.

Трэцяя катэгорыя — асобныя дактары гістарычных навук, кандыдаты гістарычных, філалагічных і іншых навук, навукоўцы без навуковых ступеняў. Звесткі пра іх — вельмі кароткія біяграфічныя, пра прадмет іх даследаванняў напісана сцісла. Выключна кароткая бібліяграфія іх даследаванняў (названы не ўсе кнігі, не гаворачы ўжо пра важнейшыя артыкулы). Фотаздымак не даецца.

У чытача адразу паўстае пытанне: каго ж з дактароў гістарычных навук «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» залічыла ў трэцюю катэгорыю? («самых горшых дактароў», дактароў з самым нізкім «каэфіцыентам карыснага дзеяння», або, як часта гавораць, «трэцеразрадных»). Гэта аўтар вядомых і высока ацэненых навуковай грамадскасцю манаграфій аб Рыжскім міры Прохар Мікалаевіч Альшанскі; беларускі і рускі фалькларыст і літаратуразнавец, аўтар сусветна вядомай манаграфіі «Беларуская казка» (1969) Леў Рыгоравіч Бараг; таленавітыя беларускія гісторыкі-аграрнікі Хаім Юдкавіч Бейлькін і Алена Паўлаўна Белязо; аўтар арыгінальнай манаграфіі «Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1951—1953 гг.)» (1999) і іншых каштоўных навуковых даследаванняў, прарэктар Беларускага універсітэта культуры Марыя Аркадзьеўна Бяспалая; аўтар некалькіх манаграфій аб грамадска-палітычных, эканамічных і культурных сувязях Беларусі з замежнымі краінамі Мікалай Сідаравіч Варабей; буйнейшы спецыяліст па гісторыі Беларусі XX ст. Уладзімір Паўлавіч Верхась; нястомны даследчык гісторыі гарадоў рэспублікі, гісторыі дзяржавы і права Беларусі, «двойчы» прафесар (па гісторыі і праве) Аляксей Фёдаравіч Вішнеўскі; знакаміты вучоны, які асвятляў праблемы рабочага і рэвалюцыйнага руху на тэрыторыі Беларусі, Аляксандра Іванаўна Воранава; даследчык палітычнай гісторыі Беларусі Георгій Георгіевіч Герасіменка; аўтар прац па гісторыі рабочага класа Беларусі Кірыла Кананавіч Герман; аўтар манаграфій аб рабочым і прафсаюзным руху на Беларусі Вера Рыгораўна Гняўко; аўтар прац па гісторыі рэвалюцыйнага руху на Палессі Яфім Дзмітрыевіч Дзіранок; нястомны даследчык гісторыі Ленінскага камсамола Беларусі Анатоль Яфімавіч Жураў; буйнейшыя спецыялісты па гісторыі Беларусі савецкага перыяду Эдуард Андрэевіч Забродскі і Мацвей Ільіч Злотнік; аўтар шэрага вучэбных дапаможнікаў, даследчык сярэдневяковай гісторыі Беларусі Аляксандр Пятровіч Ігнаценка; аўтар звыш 1000 друкаваных работ, у тым ліку аўтар і складальнік 28 кніг, гісторык, палітолаг і сацыёлаг Эмануіл Рыгоравіч Іофе; спецыяліст па гісторыі Кампартыі Беларусі Іван Аляксандравіч Кавалёў; даследчык гісторыі палітычных партый і нацыянальных праблем Уладзімір Ягоравіч Казлякоў; вядомы беларускі вучоны-археолаг Алена Генадзьеўна Калечыц; даследчык гістарыяграфіі і крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, рэдактар-складальнік гісторыка-культуралагічнай серыі «Наш радавод» (кн. 1—7, 1990—1996) Дзмітрый Уладзіміравіч Караў; буйнейшы спецыяліст па гісторыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі XVII—XVIII стст. Яфрэм Майсеевіч Карпачоў; аўтар арыгінальных манаграфій па этнакультурнай гісторыі беларусаў XX ст. Галіна Іванаўна Каспяровіч; аўтарытэтны даследчык рэвалюцыйнай барацьбы і нацыянальна-вызваленчага руху Беларусі, Літвы і Расіі Барыс Самуілавіч Клейн; вучоны еўрапейскага ўзроўню, які чытае лекцыі ва многіх універсітэтах свету, археолаг Леў Самуілавіч Клейн; аўтар манаграфій па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку пра ўдзел беларускіх настаўнікаў у барацьбе з захопнікамі, Пётр Мікалаевіч Кобрынец; аўтарытэтны даследчык гісторыі палітычных партый на Беларусі, аўтар шматлікіх вучэбных дапаможнікаў Уладзімір Канстанцінавіч Коршук; аўтар манаграфій пра археалагічныя помнікі Палесся, Верхняга і Сярэдняга Падняпроўя ад неаліту да сярэднявечча Юрый Уладзіміравіч Кухарэнка; арыгінальны даследчык гісторыі Беларусі і Польшчы XX ст. Уладзімір Фёдаравіч Ладысеў; буйнейшы вучоны-паланіст Рыгор Рыгоравіч Лазько; адзін з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі Уладзімір Іосіфавіч Лемяшонак; арыгінальны даследчык гісторыі Беларусі XIX —

пачатку XX ст. Леанід Паўлавіч Ліпінскі; аўтар даследаванняў па сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі XVIII—XIX стст.; загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя М.Танка Анатоль Міхайлавіч Люты; беларускі гісторык і філосаф Барыс Міхайлавіч Ляпешка; даследчык гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі Барыс Кірылавіч Маркіянаў; адзін з рэдактараў і аўтараў падручніка для студэнтаў ВНУ рэспублікі «Гісторыя Беларусі» (у дзвюх частках) Яўген Канстанцінавіч Новік; арыгінальны даследчык гісторыі Беларусі XX стагоддзя (асабліва 1941—1944 гг.) Якаў Савельевіч Паўлаў; аўтар унікальных манаграфій па гісторыі Беларусі XVI—XVIII стст. Дзмітрый Леанідавіч Пахілевіч; спецыяліст па праблемах гісторыі феадалізму ў Беларусі і Расіі Аляксей Пятровіч П'янкоў; беларускі археолаг, гісторык, крыніцазнавец, геральдыст Сяргей Яўгенавіч Рассадзін; даследчык гісторыі Кампартыі Беларусі Іосіф Самуілавіч Росман; вядомы вучоны-археолаг і гісторык Якаў Рыгоравіч Рыер; таленавіты гісторык і архівіст Эдуард Міхайлавіч Савіцкі; аўтар шэрага вучэбных дапаможнікаў Мікалай Канстанцінавіч Сакалоў; аўтар прац па гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі Цімафей Ерафеевіч Саладкоў; даследчык гісторыі палітычных партый у Беларусі Уладзімір Іванавіч Салашэнка; аўтар трох каштоўных манаграфій па праблемах сацыял-дэмакратычнага і рабочага руху, палітыкі царызму ў Беларусі ў другой палове XIX ст. Сусанна Міхайлаўна Самбук; гісторык і журналіст Іван Іванавіч Сачанка; даследчык гісторыі нацыянальных рухаў у Беларусі і Літве Адяксандр Фёдаравіч Смалянчук; беларускі і расійскі гісторык Анатоль Піліпавіч Смірноў; аўтар вучэбнага дапаможніка «Беларуская палеаграфія» (1996), буйнейшы спецыяліст па гісторыі культуры Беларусі Святлана Яўгенаўна Сяльвестрава; даследчык гісторыі Кампартыі Беларусі Мікалай Васільевіч Уласенка; беларускі гісторык-міжнароднік, дыпламат, рэктар Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта Мечыслаў Эдвардавіч Часноўскі; аўтар шматлікіх работ па гісторыі Кампартыі Беларусі Міхаіл Яўхімавіч Шкляр.

Ці можна лічыць вышэйназваных вучоных-гісторыкаў «трэцеразраднымі»? Мы лічым, што кіраўніцтва «Беларускай Энцыклапедыі», рэдакцыя гісторыі Беларусі тым самым дапусціла тэндэнцыйнасць і суб'ектывізм. Аб'ектыўнасцю тут, як кажуць, і не пахла.

Безумоўна, больш высокай ацэнкі і больш аб'ектыўнага асвятлення патрабуюць беларускія гісторыкі — спецыялісты па агульнай гісторыі — Уладзімір Сяргеевіч Кошалеў, Генадзь Аркадзьевіч Космач, Веніамін Аркадзьевіч Космач, Міхаіл Сямёнавіч Корзун, Аляксандр Мікалаевіч Нечухрын, Рыгор Маркавіч Трухноў, Леў Міхайлавіч Шнеерсон, вучоны з сусветным іменем у галіне гісторыі Балгарыі і беларуска-балгарскіх адносін Давід Барысавіч Мельцэр. Па сутнасці, усе яны — гонар беларускай гістарычнай навукі.

Так здарылася, што чытач не можа атрымаць звесткі аб жыцці і дзейнасці вучонага-нумізмата № 1 Рэспублікі Беларусь, доктара гістарычных навук, прафесара БДУ Валянціна Навумавіча Рабцэвіча. Шкада, вельмі шкада!

Біяграфічныя звесткі аб беларускіх пісьменніках і артыстах, а таксама агляды іх творчасці можна знайсці ў шматлікіх энцыклапедычных, даведачных і іншых выданнях, а што датычыцца многіх пісьменнікаў, звесткі пра іх змешчаны нават у школьных і універсітэцкіх падручніках па беларускай літаратуры. Таму пры ўсёй павазе да нашых пісьменнікаў, асабліва да тых, што пішуць на гістарычныя тэмы, а таксама да акцёраў-выканаўцаў роляў гістарычных асоб Беларусі немэтазгодна было такі вялікі аб'ём ЭГБ прысвячаць ім. У гэтым «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» супярэчыць усім законам логікі, калі аб прафесіянальных вучоных-гісторыках Беларусі, аўтарах шматлікіх каштоўных навуковых даследаванняў па беларускай гісторыі прыведзена значна менш звестак, чым пра пісьменнікаў і акцёраў.

Выклікае супярэчанне сама падача матэрыялаў пра вучоных-гісторыкаў. Якую даведачную нагрузку нясуць выразы: «З 1964 года ў Ін-це гісторыі АН Беларусі», «З 1978 у Бел. пед. ун-це (нават не ўказваецца, што універсітэт носіць імя Максіма Танка)»?

Значнай навізной адрозніваюцца артыкулы аб нацыянальных меншасцях Рэспублікі Беларусь — рускіх, паляках, украінцах, яўрэях, татарах і іншых этнасах, якія пражывалі і пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. Разам з тым здзіўляе, што ў асобных артыкулах пра гэтыя нацыянальныя меншасці амаль зусім знік перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва гэта бачна на артыкуле «Яўрэі», дзе рэдакцыя ЭГБ выкрэсліла самыя агульныя звесткі аб тым, што 23 яўрэі — ураджэнцы Беларусі — за подзвігі ў 1941—1945 гг. удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза, а 15 яўрэям гэта званне прысвоена за подзвігі на беларускай зямлі ў час Вялікай Айчыннай вайны, што два беларускія яўрэі сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы.

У сувязі з гэтым не вытрымлівае ніякай крытыкі артыкул «Халакост» (Т. 6. — Кн. 2. — С. 57). У ім нават не ўзгадваецца слова «Беларусь», як быццам бы гэты тэрмін не мае ніякіх адносін да нашай рэспублікі, дзе ахвярамі Халакосту сталі тры чвэрці даваеннага яўрэйскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Фактычна мы маем перад сабой спробу замоўчвання Халакосту на беларускай зямлі, што вядзе да падрыву прэстыжу нашай краіны на міжнароднай арэне.

Шкада, што ў ЭГБ няма не толькі асобнага артыкула, а нават упамінання пра поўнага кавалера ордэна Славы, ураджэнца г. Віцебска, старшага сяржанта, сапёра Рыгора Абрамавіча Багарада.

У некаторых артыкулах «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» сустракаюцца фактычныя недакладнасці. Так, пасля візы аўтара гэтых радкоў на артыкул «Кагановіч Лазар Майсеевіч» (Т. 3. — С. 522), дзе была дадзена правільная дата смерці — 25.07.1991 г., рэдакцыя звязвалася з Масквой і паставіла без ведама аўтара дату 06.08.1991 г., што не адпавядае рэчаіснасці.

Чаму аўтарамі артыкулаў па гістарыяграфіі Беларусі, за выключэннем Зіновія Капыскага, з'яўляюцца не вучоныя-гістарыёграфы? Хто ў гэтым вінаваты — аўтар артыкула «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі 19 — пач. 20 ст. у працах 1920—1990-х гг.» Міхась Касцюк або рэдакцыя ЭГБ, што аўтар манаграфіі «Адмена прыгоннага права на Беларусі» Міра Бенцыянаўна Фрыдман «ператварылася» ў мужчыну (Т. 3. — С. 25).

Чым растлумачыць той факт, што ў бібліяграфіі літаратуры пра таго ці іншага гісторыка часам не названы аўтары кніг? Так, пасля артыкула У.Вернігорава «Пічэта Уладзімір Іванавіч» у спісе літаратуры аб ім прыведзена выданне: «Академик В.Я.Пичета. Страницы жизни». — Мн., 1981. Але ў гэтай кнігі ёсць аўтары — Э.Р.Іофе, А.П.Грыцкевіч, Б.Э.Капыскі і інш.

Значнасць і прэстыж «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» зніжаюць тыя абставіны, што ў якасці навуковых работ таго ці іншага даследчыка прыводзяцца... тэзісы прац якой-небудзь інстытуцкай канферэнцыі або невялікі артыкул з кафедральнага зборніка. Наогул, на маю думку, у ЭГБ павінны былі ўвайсці звесткі аб дактарах і кандыдатах навук, якія маюць хаця б адну напісаную кнігу.

Чаму ў ЭГБ няма артыкулаў аб большасці камандзіраў партызанскіх брыгад на беларускай зямлі ў 1941—1944 гг.?

Чым можна растлумачыць той факт, што ў артыкулах пра старшынь ЦВК БССР Міхаіла Восіпавіча Стакуна і Нічыпара Якаўлевіча Наталевіча (у 1938—1947 гг. Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і намесніка Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР) адсутнічаюць іх фатаграфіі?

Але хопіць пра недахопы і недакладнасці, якія зніжаюць навуковую вартасць ЭГБ. Выхад першай у свеце «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» — велізарная з'ява не толькі ў жыцці беларускіх гісторыкаў, але і ў ва ўсім навуковым жыцці Рэспублікі Беларусь. Гэта падарунак выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі дзесяткам тысяч чытачоў не толькі нашай краіны, але і многіх краін свету, дзе жывуць беларусы, нашы землякі. Можна спадзявацца, што наступнае выданне ЭГБ выведзе яе на сусветны ўзровень.